***Яніна Грыневіч***

# ЛІЧБАВЫ КОД БЕЛАРУСКІХ ПАЗААБРАДАВЫХ ЛІРЫЧНЫХ ПЕСЕНЬ

Лічбы і злічэнне займаюць у традыцыйнай культуры адметнае месца. Грунтоўнаму вывучэнню нумералогіі ў архаічных культурных традыцыях прысвечаны работы У.Тапарова [11], [12], [13], [14], [15], [16]. Ён выявіў, што «ядро старажытнейшай дасягаемай для рэканструкцыі індаеўрапейскай сістэмы злічэння складаюць 2,3,4 (1, 5, 6, 7 і г.д. у гэтым сэнсе да ядра не адносяцца), і асаблівы статус гэтых лічбаў у старажытных індаеўрапейскіх мовах і ў цэлым шэрагу сучасных (асабліва выразна ў славянскіх і балтыйскіх) тлумачыцца менавіта гэтай іх прыналежнасцю да архаічнага слоя. Надзвычай характэрна, што менавіта гэтыя лічбы адыгрываюць выключную ролю ў міфапаэтычнай касмалогіі, а іх моўная форма найглыбейшым чынам звязана з рэаліямі касмалагічнай карціны свету» [13, с. 305]. Вучоны прыйшоў да абгрунтаванай высновы пра тое, што ў архаічных культурных традыцыях «Лічба і Злічэнне былі сакралізаванымі сродкамі арыентацыі і «касмізацыі» Сусвету. З іх дапамогай кожны раз, калі гэта было патрэбна, рэпрадукавалася структура Космасу і месца чалавека ў ёй»[14, с. 52].

Займаліся вывучэннем лічбавага коду і беларускія навукоўцы. Т.Валодзіна вызначыла сімволіку лічбы сорак [3, с. 6-9]. Я.Крук выявіў сімволіку лікаў, цотнасці/няцотнасці ў традыцыйных уяўленнях беларусаў [5]. У артыкулах Л.Дучыц, Э.Зайкоўскага, І.Клімковіч і інш., апублікаваных у энцыклапедычным слоўніку «Міфалогія беларусаў» [8], на прыкладзе багатага матэрыялу фальклорнай прозы выяўлена іх семантыка. Аднак песенныя творы аўтарамі не ўлічваюцца, што і абумоўлівае актуальнасць нашай работы.

Лічбавы код лірычных песень прадстаўлены лічбамі першай дзясяткі (адзін, два, тры, чатыры), а таксама лічбай сорак[1]. Разгледзім лічбавы код згодна з падзелам на няцотныя і цотныя лічбы, які ўплывае на іх семантыку[2].

Найбольш частотным элементам лікавага коду ў песнях з'яўляецца лічба тры («Ой, у полі, полюшку…» [17, №273], «Наварылі два брацiткі…»[17, №214] і інш). У.Тапароў зазначае, што ў архаічных культурных традыцыях яна служыць ідэальнай мадэллю любога дынамічнага працэсу, якая прадугледжвае ўзнікненне, развіццё і заняпад [13, с. 302]. Пры гэтым «міфапаэтычныя ўяўленні пра «тры»паўней за ўсё рэалізуюцца ў архаічных схемах, прымеркаваных да вертыкальнай восі светабудовы, канкрэтней – да сюжэтаў і матываў сувязі трох касмічных зон паміж сабой. Так званы «трэці»як раз і ёсць той міфалагічны герой, хто прайшоў усе тры царствы і знайшоў шлях для пераадолення смерці»[13, с. 306]. У беларускіх пазаабрадавых песнях лічба тры вылучае пэўнага персанажа, аб'ект і г.д., на чым будуецца сюжэт («Чые гэта шэры валы…»[7, с. 98], «Кукавала зязюленька…»[7, с. 122] і інш.): «Ляцела зязюлька праз сад кукуючы, // заплакаў малойчык з вячорак ідучы. // Прыйшоў ён дадому, не сказаў нікому, // прыйшоў ён у пуню і стаў думаць думу. // Першая любіла, хустачку дарыла, // другая любіла – белу пасцель слала, // трэцяя любіла – ўзяла атравіла, // пад вішнёвы кусцік спаці палажыла. // Прыйшоў яго бацька і стаў прабуджаці: // – Ўставай, родны сыне, паедзем араці. // – Не магу я ўстаці, не пайду араці, // не здолею, татка, на валы гукаці. // Прыйшоў яго брацец і стаў пабуджаці: // – Ўставай, родны браце, пойдзем мы касіці. // – Не здолею, братка, касой занасіці. // Прыйшла яго сястра, стала пабуджаці: // – Ўставай, родны браце, пойдзем мы гуляці. // – Не магу я ўстаці, не пайду гуляці, // не здолею з дзеўкамі больш жартаваці. // Прыйшла яго маці, стала наракаці: // – Было табе, сынку, дзевак не кахаці, // вось табе, мой сынку, такая заплата: // тры дошкі сасновых і цёмная хата»[7, с. 167]. У песні выкарыстаны прыём траічнасці, які засяроджвае ўвагу на асноўным (як правіла, трэцім) героі твора. Аднак лічба тры з'яўляецца не толькі элементам зместу, але з ёй звязаны «лічбавы»прынцып арганізацыі кампазіцыі: шэраг твораў пабудаваны як трохразовы паўтор аднатыпных эпізодаў («Ой, там за ракою…»[2, №2], «У нядзельку раненька на зары…»[7, с. 115] і інш.). Таксама лічба тры ўвасабляецца ў тыповых для лірычных песень паслядоўнасці персанажаў старэйшы – сярэдні – малодшы сыны («А ўзышлі, ўзышлі тры месяцы ясны…»[2, №148], «Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага…»[2, №234] і інш.), маці – сястра – жонка («Ляжыць цела, як дзень, бела…»[2, №215], «У чыстым полі пад белай бярозкаю…»[17, №228] і інш.), у якіх рэалізуюцца традыцыйныя ўяўленні пра падзел свету на тры часткі: нябесную, зямную і падземную, дзе кожнаму персанажу адпавядае свой ярус светабудовы. У цэлым, у пазаабрадавых лірычных песнях лічба тры спалучаецца з вялікай колькасцю аб'ектаў, персанажаў, з'яў, выкарыстоўваецца для абазначэння часу і месца дзеяння, якія маюць цэнтральнае значэнне для развіцця сюжэту: «Жыву я гадочак, // жыву і другі, // кругом усе чужыя, // усё недругі. // А на трэці годзічак // думала сабе: // палячу зязюлькаю // да маткі свае»[2, №52]. Аднак яна не заўсёды спалучаецца з прадметамі, якія маюць станоўчыя канатацыі: частотным з'яўляецца сюжэт пра «тры беданькі»ў хаце замужніцы («Дуе вецер…»[2, №26], «Ой, дай божа нядзелькі даждаці…»[2, №19] і інш.): «Я не буду // споўна выпіваць, // бо я маю // тры беданькі ў хаце: // адна бяда - // дзяціна малая, // друга бяда - // сама маладая. // Друга бяда - // сама маладая, // трэця бяда – свякруха ліхая»[2, №19]. У такім кантэксце яна

[1] Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены лічбы пяць, шэсць, восем, дзевяць, дзесяць, сто, трыста.

[2] Асноўным адрозненнем паміж імі на думку У.М. Тапарова з'яўляецца тое, што няцотныя лічбы звязваюцца з мужчынскім пачаткам (дынамічнасць, актыўнасць), а цотныя – з жаночым (устойлівасць, інэртнасць) [14, с. 25].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абазначае паняцці «многа", «шмат". Высокая частотнасць ужывання, семантыка лічбы тры ўказваюць на яе сакральны характар у песнях, што пацвярджаюць высновы Л.Дучыц і І.Клімковіч [4, с. 476].

Акрамя трох сярод няцотных прадстаўлена лічба сем («Дзе тое жыта біта…»[2, №77], «Ой, сарву я ружы кветку…»[2, №89] і інш.). Як зазначае У.Тапароў лічба сем узнікае з сумы двух асноўных лічбавых параметраў «тры»і «чатыры»[14, с. 25] і ў шэрагу традыцый утварае касмалагічную канстанту [16, с. 320]. Аднак нягледзячы на свой статус у архаічнай культуры ў песнях яна прадстаўлена не так шырока і не нясе такой семантычнай нагрузкі: «— Ой, дзесь маё родна дзіця // сем нядзель ляжала, // ой, што з ружы, ружы кветка // на вадзе завяла!»[2, №89]. Як правіла, яна мае семантыку працяглага часу. Разам з тым «сем год»у лірычных песнях абазначаюць сталасць, гатоўнасць да шлюбу, мяжу: «Гэй, у бары сосна // тонкая выросла, // а я, маладзенька, // сем лет не даросла. // А я, маладзенька, // сем лет не даросла, // сем лет не даросла, // скора замуж выйшла. // Ой, выйшла я замуж, // замуж маладая, // ой, спаткала мяне // долечка ліхая»[2, №38]. Нярэдка лічбы тры і сем фігуруюць у аднолькавых кантэкстах і выступаюць узаемазамяняльнымі: дзяўчына хварэе «сем нядзель»[2, №89] і «тры гады»[2, №128] і інш.

Сярод цотных лічбаў асабліва пашырана лічба два («А ў лузе, лузе сад зеляненькі…»[2, №68], «Ой, коцяцца два яблычкі…»[9, №34] і інш.). Паводле У.Тапарова выкарыстанне лічбы два характэрна пры ўказанні парнасці, блізнечнасці, непадзельнасці двух элементаў ці іх супрацьпастаўленасці [16, с. 323]. Менавіта ў такім кантэксце яна выкарыстоўваецца ў лірычных творах: абазначае пару закаханых; мужа і жонку; двух братоў, сясцёр, таварышаў, малайцоў.

Частотнай з'яўляецца лічба чатыры («Пайду я гуляючы…»[17, №176], «Ты, каліна…»[2, №105] і інш.). У.Тапароў заўважае, што ў архаічных тэкстах «лічба чатыры абазначае статычную цэласнасць, ідэальна ўстойлівую структуру»[14, с. 23] і ў касмаганічных міфах чатырохчастковая мадэль суадносіцца з гарызантальнай воссю [14, с. 24]. У песенных творах яна спалучаецца з рознымі прадметамі, аб'ектамі, з'явамі, якія не маюць сакральнага характару: «Пагаворым, сэрца, // - прынясём вядзерца, // пагаворым, дружа, - // прынясём другое, // пагаворым шчыра - // прынясём чатыры»[2, №172]. Распаўсюджанай з'яўляецца формула «тры – на чацвертую»(«Парадзіла маці сына, ох, ого…»[10, №226], «Ты, каліна, ты чырвоная была…»[2, №105] і інш.). У.Тапароў трактуе вобраз малой прыблізнасці 3-4 як кан'юнкцыю гэтых двух асноўных лічбаў [14, с. 27]. У творах ёй перадаецца семантыка завершанасці, заканчэння пэўнага працэсу: «Усе тры ночкі да галоўкі валіў, // а на чацвёрту сам голаў злажыў»[17, №226].

Прадстаўлена ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях і лічба сорак («Ой, у полі да ў чысценьком…»[10, №178], «Ой, запяю песню вясёлую…»[1, с. 497-498] і інш.). Яна мае семантыку пэўнага часавага прамежку, які адводзіцца чалавеку для канчатковага пераходу ў гэты свет, адужання, сталення: «- Да у мяне цешча міла на прывет, // жонка міла, як добры быт; // матка ж мая родненькая, // ты мне мілейша за ўвесь свет. // Ты ж мяне цяжэнька насіла, // яшчэ цяжэй радзіла; // сорак свечак ясненькіх спаліла, // покі мяне выкарміла; // сорак ночак цёмненькіх не спала, // покі мяне, маладзенькага, згадавала»[17, №178]. У аснове такіх уяўленняў ляжыць «разуменне сімволікі ліку сорак як памежжа, як своеасаблівай лімінальнай зоны, бо ён, з аднаго боку, скіраваны ў свет продкаў, а з другога – з'яўляецца трансферам паміж выраем і светам жывых»[16, с. 457]. Т.Валодзіна тлумачыць, што сорак дзён – «гэта тэрмін, на працягу якога дзіця і парадзіха пераадольвалі вынікі свайго лімінальнага стану»[3, с. 6]. Таксама лічба сорак мае семантыку працяглага адрэзку часу: «На гары дубочак, // зялёны лісточак, // няма майго міленькага // ўжо трэці дзянёчак. // Адзін панядзелак, // а другі аўторак, // я думала, маладзенька, // што нядзелек сорак»[9, №82а].

Такім чынам, у беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях лічбы маюць канкрэтны характар. Самымі частотнымі з'яўляюцца лічбы тры, два і чатыры. Лічба тры выкарыстоўваецца для абазначэння трыяды персанажаў (старэйшы-сярэдні-малодшы брат, маці-сястра-жонка), праз якія рэалізуюцца ўяўленні пра 3-частковую светабудову, дзе кожнаму з персанажаў адпавядае свой ярус; для вылучэння пэўнага персанажа, чым падкрэслівае яго значнасць, і на чым будуецца сюжэт твора; для абазначэння часу, месца дзеяння, колькасці прадметаў, з'яў і г.д., якія маюць цэнтральнае значэнне для развіцця сюжэту песні. Важным кампазіцыйным прынцыпам выступае трохразовае паўтарэнне аднатыпных канструкцый. Гэтыя характарыстыкі ўказваюць на сакралізацыю лічбы тры ў лірычных песнях. Лічба два мае значэнне парнасці, якая рэалізуецца ў вобразах пары закаханых, мужа і жонкі, двух братоў, сясцёр, таварышаў, малайцоў. З лічбай чатыры звязана формула «тры – на чацвёртую", якой перадаецца значэнне завершанасці. Сем мае семантыку «многа", «шмат", а таксама абазначае мяжу, узрост для ўступлення ў шлюб. У некаторых кантэкстах лічбы тры і сем выступаюць узаемазамяняльнымі. Сорак мае семантыку часавага прамежку, які адводзіцца чалавеку для канчатковага пераходу ў гэты свет, адужання, суадносіцца з паняццем «працяглы час".

**Спіс літаратуры:**

1. Беларускі фальклор : хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. – 3-е выд., перапрац. – Мінск : Вышэйш. шк., 1985. – 749 с.
2. Беларускія народныя песні : у 4 т. / запіс Р. Шырмы. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1960. – Т. 2 : Жаночая доля, недабраная пара, хрэсьбінныя і сіроцкія, казацкія, рэкруцкія і салдацкія, батрацкія і прымацкія, песні нявол і змагання. – 430 с.
3. Валодзіна, Т. В. Аб міфапаэтычнай сімвалізацыі лічбы сорак / Т. В. Валодзіна // Веснік БДУ. – С. 6-9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Дучыц, Л. Тры / Л. Дучыц, І. Клімковіч // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 475–476.
5. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.
6. Крук, І. Сорак / І. Крук // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 456–457.
7. Лірычныя песні / укл. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 462 с.
8. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.
9. Песні пра каханне / склад., камент. І. Цішчанкі ; муз. частка С. Нісневіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.
10. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад. сістэматызацыя тэкстаў, уступ. артыкул і камент. І. К. Цішчанкі і інш. ; уклад. муз. часткі Г. В.Таўлай ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 488 с.
11. Топоров, В. Н. Заметка о числовом коде русских загадок / В. Н. Топоров // Исследования по этимологии и семантике. Т. 1 : Теория и некоторые частные ее приложения. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – С. 350–361.
12. Топоров, В. Н. К семантике троичности (слав. *trizna и др.) / В. Н. Топоров // Этимология 1977. – М., 1979. – С. 3–20.
13. Топоров, В. Н. К семантике четверичности (анатолийское *meu- и др.) / В. Н. Топоров // Исследования по этимологии и семантике. Т. 1 : Теория и некоторые частные ее приложения. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – С. 293–317.
14. Топоров, В. Н. О числовых моделях в архаичных текстах / В. Н. Топоров // Структура текста. – С. 3—58.
15. Топоров, В. Н. Числовой код в заговорах. По материалам сборника Л. Н. Майкова «Великорусские заклинания» / В. Н. Топоров // Исследования по этимологии и семантике. Т. 1 : Теория и некоторые частные ее приложения. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – С. 331–349.
16. Топоров, В. Н. Число и текст / В. Н. Топоров // Исследования по этимологии и семантике. Т. 1 : Теория и некоторые частные ее приложения. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – С. 317–330.
17. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / пад рэд. В. К. Бандарчыка, К. П. Кабашнікава, А. С. Фядосіка. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 329 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ